# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА СТУДЭНТА ЯК НЕАБХОДНАЯ ЎМОВА ФАРМІРАВАННЯ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ

***Т. І. Віткоўская,***
*старшы выкладчык кафедры замежных моў*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка;*

***А. У. Чурай,***
*выкладчык кафедры замежных моў*
*Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Прыярытэтнай праблемай рэфармавання сістэмы вышэйшай адукацыі з'яўляецца павышэнне якасці навучання, арыентацыя на фарміраванне, перш за ўсё, рознага роду кампетэнцый, сярод якіх вылучаюць акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя і прафесійныя кампетэнцыі. Прынцыпова новае значэнне набывае пошук шляхоў удасканалення падрыхтоўкі спецыяліста.

Такая падрыхтоўка магчымая ва ўмовах спецыяльна арганізаванага навучальнага працэсу, які забяспечвае выпрацоўку неабходных прафесійных уменняў і навыкаў. З гэтай мэтай у БДПУ на першым курсе выкладаецца дысцыпліна «Замежная мова» ў аб'ёме 140 гадзін: 72 гадзіны

ў першым семестры (форма кантролю – залік) і 68 гадзін у другім семестры (форма кантролю – экзамен). Навучанне ажыццяўляецца ў акадэмічных групах па 11–12 чалавек. На першых занятках прапануецца тэсціраванне для вызначэння ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў і расстаноўку акцэнтаў у навучальным матэрыяле. У кожным семестры прадугледжаны 3 рэйтынгавыя кантрольныя работы, вынікі якіх уносяцца ў рэйтынгавую ведамасць і ўплываюць на адзнаку на экзамене. У вучэбным працэсе прадугледжана правядзенне практычных заняткаў як у традыцыйнай, так і ў інтэрактыўнай форме: «круглы стол», дыскусія, ролевыя і дзелавыя гульні, а таксама розныя віды самастойнай працы.

«Абавязковай састаўной часткай навучальнага працэсу па замежнай мове з'яўляецца самастойная праца студэнтаў пад непасрэдным або апасродкаваным кіраўніцтвам выкладчыка на аснове распрацаваных ім метадычных указанняў, інструкцый, памятак па арганізацыі самастойнай дзейнасці вучняў як на занятках, так і ва пазааўдыторны час» [1, с. 131]. Пад самастойнай працай разумеюць разнастайныя віды індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці навучэнцаў, якія ажыццяўляюцца на занятках або дома па заданнях без непасрэднага ўдзелу выкладчыка. У сістэме вышэйшай адукацыі самастойная праца студэнтаў – гэта від вучэбнай дзейнасці студэнтаў у працэсе асваення зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі, што ажыццяўляецца самастойна па-за аўдыторыяй (у бібліятэцы, навуковай лабараторыі, у хатніх умовах і г.д.) з выкарыстаннем розных сродкаў навучання і крыніц інфармацыі. Асноўнай мэтай самастойнай працы ў ВНУ з'яўляецца актывізацыя вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, якая спрыяе фарміраванню ў іх уменняў і навыкаў самастойнага набыцця і абагульнення ведаў, здольнасці самастойна прымяняць веды на практыцы, а таксама забяспечвае іх самаразвіццё і самаўдасканаленне [2].

У сучаснай адукацыйнай практыцы існуюць дзве агульнапрынятыя формы самастойнай працы: аўдыторная і пазааўдыторная. Пазааўдыторная самастойная праца (далей самастойная праца) – запланаваная вучэбная, вучэбна-даследчая, навукова-даследчая работа студэнтаў, якая выконваецца ў пазааўдыторны час па заданні і пад метадычным кіраўніцтвам выкладчыка, але без яго непасрэднага ўдзелу. Аўдыторная самастойная праца праводзіцца пад кантролем выкладчыка, у якога ў час выканання задання можна атрымаць кансультацыю. Пазааўдыторная – выконваецца самастойна ў адвольным рэжыме часу ў зручныя для студэнта гадзіны, часта па-за межамі аўдыторыі.

На практычных занятках прапануюцца наступныя віды самастойнай працы, накіраваныя на актывізацыю пазнавальнай дзейнасці студэнтаў:

– вусныя франтальныя і індывідуальныя апытанні;

– кантрольныя пісьмовыя работы;

– выніковае сумоўе;

– правядзенне (распрацоўка) тэрміналагічнай крыжаванкі па вывучаемай тэме;

– выкананне студэнтамі тэставых заданняў;

– фармулёўка студэнтамі пытанняў па тэме практычных заняткаў;

– падрыхтоўка камп'ютарных прэзентацый;

– даклады і паведамленні.

У межах пазааўдыторнай дзейнасці студэнты рыхтуюць традыцыйныя справаздачныя матэрыялы:

– дыдактычныя гульні з наглядным матэрыялам;

– дыдактычныя матэрыялы;

– справаздачы па вывучаных раздзелах з выкарыстаннем мультымедыйнай прэзентацыі;

– бібліяграфічныя спісы па тэмах і інш.

Акрамя таго, у межах пазааўдыторнай дзейнасці студэнты займаюцца пошукам даведачнай інфармацыі, выкарыстоўваючы электронныя рэсурсы электронных газет, часопісаў, метадычных дапаможнікаў, электронных падручнікаў у сістэме Moodle для падрыхтоўкі дакладаў, паведамленняў, рэфератаў, партфоліа.

Абапіраючыся на магчымасці камп'ютарных тэхналогій, можна вылучыць наступныя віды працы:

– праца з камп'ютарнымі слоўнікамі і энцыклапедыямі. Камп'ютарныя слоўнікі дазваляюць студэнтам знайсці значэнні слоў і фразеалагізмаў, сінонімы, антонімы, скарачэнні і г. д. Энцыклапедыі з'яўляюцца крыніцай краіназнаўчай інфармацыі, уключаюць ілюстрацыі, фатаграфіі, схемы, геаграфічныя карты і іншыя візуальныя апоры. Студэнты карыстаюцца энцыклапедыямі для падрыхтоўкі невялікіх паведамленняў, рэфератаў, выступленняў;

– праца з відэаматэрыяламі, якія ствараюць іншамоўнае асяроддзе і адлюстроўваюць рэаліі краіны носьбітаў мовы;

– чытанне аўтэнтычных матэрыялаў. Інтэрнэт дазваляе студэнту, які вывучае замежную мову, пазнаёміцца з мастацкай літаратурай, сусветнымі навінамі, разнастайнымі артыкуламі і г. д.;

– удзел у чатах, што з'яўляецца асабліва цікавай формай працы для студэнтаў, бо ў працэсе зносін развіваюцца ўменні чытання і пісьма на замежнай мове.

Прапанаваныя віды працы можна выкарыстоўваць як на занятках, так і пры выкананні пазааўдыторнай самастойнай работы.

Камп'ютарныя тэхналогіі адкрываюць шырокія магчымасці павышэння моўнай падрыхтоўкі студэнтаў пры навучанні замежным мовам. Акрамя таго, выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій у працэсе навучання і саманавучання павышае матывацыю, цікавасць студэнтаў да засваення

дысцыпліны, актывізуе іх самастойную працу; дае магчымасць атрымліваць веды, неабходныя ў іх будучай прафесійнай дзейнасці. Інфармацыйныя тэхналогіі з'яўляюцца магутным сродкам развіцця такіх якасцяў асобы будучага спецыяліста, як актыўнасць, самастойнасць, здольнасць да нестандартнага мыслення, выступаюць сродкам выхавання камунікатыўнай культуры; спрыяюць развіццю разумовых працэсаў, палягчаюць працэс засваення студэнтамі ведаў па дысцыпліне.

Эфектыўнасць самастойнай работы студэнта абумоўлена шэрагам фактараў, сярод якіх найважнейшымі з'яўляюцца:

– гатоўнасць навучэнца да самастойнай працы;

– аптымальная арганізацыя самастойнай працы і карэкцыя яе педагогам.

Адметнай рысай самастойнай працы з'яўляецца яе яскрава выражаны індывідуальны характар. Яна ўяўляе сабой форму самаадукацыі, якая цесна звязана з вучэбнай дзейнасцю студэнта на аўдыторных занятках. Але самастойнай працы, як і любому іншаму віду дзейнасці, неабходна навучыць, паколькі наяўнасць такіх навыкаў у студэнтаў, на жаль, сустракаецца далёка не заўсёды. Многія студэнты адчуваюць вялікія цяжкасці, звязаныя з адсутнасцю навыкаў аналізу, канспектавання, працы з аўтэнтычнымі крыніцамі, уменняў выразна і ясна выкладаць свае думкі, планаваць свой час, улічваць індывідуальныя асаблівасці сваёй разумовай дзейнасці. Паколькі самастойная праца – найважнейшая форма навучальнага працэсу, выкладчыкі акцэнтуюць увагу студэнтаў на яе ўплыў на фарміраванне такіх параметраў кваліфікацыйнай характарыстыкі, як мабільнасць, уменне прагназаваць сітуацыю і актыўна ўплываць на яе. Неабходна, каб студэнты бачылі станоўчыя вынікі сваёй працы і каб поспех у навучанні спрыяў трансфармацыі апасродкаванага навучання ў іх прафесійную дзейнасць. Самастойная праца прызначана не толькі для авалодання дысцыплінай, але і для фарміравання навыкаў самастойнай работы ўвогуле – у вучэбнай, навуковай, прафесійнай дзейнасці; для набыцця здольнасцяў прымаць на сябе адказнасць, самастойна вырашаць праблему, знаходзіць канструктыўныя рашэнні, знаходзіць выйсце з крызіснай сітуацыі і г. д. Вышэйшая школа адрозніваецца шматлікімі параметрамі, у тым ліку методыкай вучэбнай працы і ступенню самастойнасці навучэнцаў. Выкладчык ВНУ толькі арганізуе пазнавальную дзейнасць студэнтаў, студэнт жа сам ажыццяўляе пазнанне. Самастойная праца з'яўляецца завяршэннем усіх відаў маўленчай дзейнасці.

У сферы маўлення найлепшы варыянт арганізацыі самастойнай працы – заданні на пастаноўку ролевай гульні і на падрыхтоўку да абмеркавання прапанаванай праблемы. Вядома, пры адборы патрэбнага

матэрыялу пажадана звяртацца да аўтэнтычных крыніц, але тут трэба ўсведамляць рэальны ўзровень валодання навучэнцамі мовай.

У працы па развіцці навыку самастойнай работы з пісьмом можна выкарыстоўваць наступныя заданні камунікатыўнай накіраванасці:

– напісанне асабістага або афіцыйнага (дзелавога) ліста;
– апісанне падзеі;
– падрыхтоўка рэкламнага тэксту;
– фармулёўка пытанняў для інтэрв'ю.

Важнай часткай працы павінна быць, натуральна, граматыка. Выкарыстоўваючы для працы над граматыкай аналітычны падыход, выкладчык першапачаткова дае студэнту магчымасць самастойна сфармуляваць правілы выкарыстання граматычных структур або формаў, а затым параўнаць іх з тымі правіламі, якія прыведзены ў падручніку.

Для развіцця навыку чытання эфектыўныя тэксты невялікага аб'ёму і разнастайнага зместу (часопісныя артыкулы, інтэрв'ю, урыўкі літаратурных твораў, вэб-сайты, анкеты, рэкламныя артыкулы, урыўкі з энцыклапедый і г. д.). Пры падборы тэкстаў для чытання, выкарыстоўваецца краіназнаўчага матэрыял, паколькі гэта адыгрывае вялікую ролю ў развіцці і падтрыманні матывацыі – крыніцы пазнавальнай актыўнасці ў працэсе вывучэння замежнай мовы. Навучэнцы знаёмяцца з рэаліямі краіны вывучаемай мовы, атрымліваюць дадатковыя веды ў галіне геаграфіі, адукацыі, культуры і т. д. Выкарыстанне краіназнаўчай інфармацыі спрыяе развіццю пазнавальнай актыўнасці, пашырэнню камунікатыўных магчымасцяў, жаданню ўдасканальвацца ў вывучэнні замежнай мовы.

Самастойная праца можа быць эфектыўнай толькі пры сістэматычным яе кантролі. Істотным момантам у кантролі з'яўляецца аказанне неабходнай дапамогі студэнтам у авалоданні асноўнымі метадамі арганізацыі самастойнай работы, асабістай разумовай працы, методыкай рацыянальнага выкарыстання бюджэту часу. Паколькі навучанне прадугледжвае адказную індывідуальную працу студэнтаў на працягу ўсяго курса навучання замежнай мове, істотнай з'яўляецца аб'ектыўная ацэнка канчатковых вынікаў працы – не толькі набытых ведаў і навыкаў, але і сістэматычнасці у працы, добрасумленнасці выканання заданняў, матываванасці і актыўнасці ў выбары сродкаў дасягнення пастаўленых мэт.

Па выніках вывучэння дысцыпліны праводзіцца групавое абмеркаванне выніковасці вучэбнай дзейнасці студэнтаў (на працягу семестра; усяго тэрміну навучання прадмета; асобнай тэмы), пры гэтым улічваецца прадстаўленне вынікаў сродкамі інфармацыйных тэхналогій; падрабязны аналіз і ацэнка (уключаючы рэкамендацыі па ўдасканаленні); даклады і паведамленні, выкананне тэстаў. Карысць добра распрацаванага тэсту бясспрэчная. Ён дае магчымасць аб'ектыўнай, незалежнай ад выкладчыка ацэнкі ведаў, паколькі ўсе студэнты знаходзяцца ў аднолькавых умо-

вах, а вынікі ацэньваюцца па адзіных крытэрыях – эталонах (ключах). З упэўненасцю можна сказаць, што метад тэсціравання, асабліва ў межах інавацыйнай тэхналогіі, ажыццяўляе пераход на новую сістэму кантролю якасці ведаў і набывае асаблівую актуальнасць у сувязі з працэсам мадэрнізацыі і стандартызацыі адукацыі.

Такім чынам, прафесійная падрыхтоўка будучых спецыялістаў, арыентаваная на фарміраванне прафесійных кампетэнцый, павінна рэалізавацца як адзінае цэлае, як сістэма прадметнай падрыхтоўкі, навучання мадэляванню педагагічных сітуацый і прагназавання выніку.

На сучасным узроўні выкладання замежных моў у ВНУ самастойная праца з'яўляецца неад'емнай часткай навучальнага працэсу і мае на мэце падрыхтаваць студэнтаў да далейшай самаадукацыі як сродку пошуку і набыцця сацыяльнага вопыту, з дапамогай якога будучы спецыяліст зможа працягнуць сваю прафесійную падрыхтоўку. Інтэнсіўная самастойная праца студэнтаў – абавязковая ўмова паспяховага функцыянавання ўсёй сістэмы навучання.

### БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. Бабинская, П. К. Практический курс методики преподавания иностранных языков / П. К. Бабинская и др. – Минск : Тетра Системс, 2009. – 288 с.
2. Положение о самостоятельной работе студентов [Электронный ресурс] // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/1480. – Дата доступа: 11.01.2019.